# Жыве ў Слоніме Слова...



Слонімскае літаратурнае аб’яднанне мае сваю гісторыю і традыцыі. Гісторыя: у творах і кнігах. Традыцыі: у пераемнасці пакаленняў, у таленце людзей, якія ўзгадаваны ці ўскормлены гэтай зямлёй, людзей, якія пакланіліся велічы і хараству зямлі слонімскай, і выйдучы на шырокія прасторы Радзімы не здрадзілі, не кінулі, не пасароміліся сваіх вытокаў, а наадварот, успелі родную зямлю ў сваіх пачуццях і творах.

Слонімшчына — радзіма польскага паэта-перакладчыка Ю.Корсака (1806-1885), беларускага пісьменніка пачатку 20 стагоддзя К.Лейкі (1860-1921), філолага, гістрыка і перакладчыка К.Пушкарэвіча (1890-1942), беларускага паэта Гальяша Леўчыка, (1880-1944), Сяргея Дарожнага (1909-1943), паэтаў Валянціна Таўлая, паэта, празаіка, крытыка, вучонага, доктара філалагічных навук, прафесара, члена-карэспандэнта Акадэміі навук Алега Лойкі, паэтаў Анатоля Іверса, Міколы Арочкі, гісторыка і археолага Васіля Супруна, літаратуразнаўцы і фальклорыста Янкі Саламевіча, празаіка, драматурга, крытыка  Уладзіміра Ягоўдзіка, паэта і краязнаўцы Сяргея Чыгрына, дзіцячага пісьменніка Аляксея Якімовіча і іншых творчых людзей.

Традыцыйна пры раённай газеце збіраліся творча адораныя людзі: літаратары, мастакі, музыканты. Абмяркоўвалі новыя творы, вучыліся ў папярэднікаў і наступнікаў, будавалі планы на будучыню. Так у 90-ыя гады мінулага стагоддзя  раённая газета аб’яднала творчую інтэлігенцыю Слонімшчыны.У 1994 годзе быў выдадзены літаратурны альманах “Золак над Шчарай”. Яго прадстаўлялі  літаратары, члены Саюза пісьменнікаў Анатоль Іверс, Іван Сяргейчык, Васіль Супрун, Алена Руцкая, паэты Алесь Сучок, Рудольф Пастухоў, Ірына Войтка, Алена Бурсевіч і іншыя.

З 2002 г літаратурные аб’яднанне, створанае пры раённай газеце “Слонімскі веснік” пачало насіць імя Анатоля Іверса, паэта-земляка, члена Саюза пісьменікаў Беларусі, партызана-антыфашыста. Кіраўніком быў абраны пісьменнік-афганец Іван Сяргейчык. У 2005 г. намаганнямі кіраўніка літаб’яднання выйшаў другі  альманах слонімскіх  літаратараў “Пад гукі паланэза”. Побач з імёнамі  вядомых літаратараў новыя імёны: Ганна Паўлава, Алена Руж, Мар’ян Медушэўскі, Святлана Пракоф’ева. Асаблівае месца ў альманаху адпушчана насельніку Жыровіцкага манастыра, паэту-інаку Мікалаю (у свеце Алегу Бембелю (Зьнічу), публіцыстыка прадстаўлена таленавітым журналістам, стваральнікам этнаграфічнага  музея-майстэрні “Беларускае мястэчка” Міхаілам Рылко.

Члены літаратурнага аб’яднання ладзяць творчыя сустрэчы і вечары, праводзяць прэзентацыі кніг, юбілеі паэтаў-землякоў, падтрымліваюць творчыя сувязі са сталічнымі і абласнымі пісьменнікамі, праводзяць сустрэчы ў навучальных установах, бібліятэках горада, іх творы гучаць на раённым радыё, змяшчаюцца ў абласным і рэспубліканскім друку. У 2005 г. на творчую сустрэчу ў Слонім завіталі супрацоўнікі рэдакцыі часопіса “Вожык”: У.Саламаха, К.Камейша, П.Саковіч, паэтка Данута Бічэль, у 2007 і 2015 г. – унучка Я.Коласа В.Д.Міцкевіч, у 2012 г. — члены Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Л.Кебіч, Б.Ермашкевіч, Г.Скаржынская, Г.Самойла і іншыя пісьменнікі.

На сягонняшні дзень аб’яднанне налічвае 10 чалавек. Выдадзены кнігі паэзіі і прозы: “Горкі пыл Гіндукуша”, “Без права на літасць”, “Сцяжынка школьная мая” Івана Сяргейчыка; ”Мгновения радости и печали”, ”Я только частица огромного мира” Зарэмы Трафімовіч; ”Спасціжэнне” і “Пагляджу вачамі неба” Ірыны Войткі; “Почувствуйте апрель…”, “Своему другу”, ”Рассказы для внучкі” члена Саюза пісьменнікаў Расіі Таісіі Гуськовай; “Осенний возраст — это просто зрелость” Тамары Пяцелінай; “Шыганы вы мае, Шыганы” Алены Чайкоўскай”; кнігі сатыры і гумару “Емелькавы замарочкі” і “Проза жизни” Міколы Емельянчука; кніга дзіцячай паэзіі Алены Руж ”Встретимся под радугой”; “Перекрёсток“ Надзеі Салейка і іншыя. За 2014-2015 г.г. праведзены 3 прэзентацыі кніг мясцовых літаратараў, каля 30 творчых сустрэч, прагучала 6 перадач на раённым радыё з удзелам слонімскіх паэтаў.

Літаратурнае аб’яднанне, створанае пры газеце “Слонімскі веснік”, рэгулярна выпускае старонку ”Літаратурнае кафэ”, мае свой архіў. Яно жыве, дзейнічае, праводзіць работу з моладдзю па захаванню і папулярызацыі беларускай мовы і культуры. Сюды прыходзяць і далучаюцца людзі, каб наталіць душу хараством і веліччу Слова, каб несці святло і дабрыню па жыцці.

З 2006 г кіраўніком літаратурнага аб,яднання імя Анатоля Іверса з’уляецца член Саюза пісьменнікаў Беларусі паэтка Ірына Войтка.

***Ірына ВОЙТКА***

***На фота:*** эпізоды з жыцця, выданні і аўтары літаратурнага аб’яднання імя Анатоля Іверса.



**Адзначыць каб добрую ўдачу,**
**Я зораў з сабой набяру**
**І жменяю сыпну — няйначай,**
**На славу табе, Беларусь.**

***Анатоль Іверс (1912-1999)***











Прэзентацыі кніг Надзеі Салейка і Алены Чайкоўскай.



Сустрэча паэтэсы Алены Руж з маленькімі чытачамі ў дзіцячым садку №7 горада Слоніма. 21.02.2014.



Адно з паседжанняў літаб’яднання.



Шчучын. Дзень Беларускага пісьменства. 6.09.2015













Іван СЯРГЕЙЧЫК
Без права
на літасць


Елена Ржеусская
Встретимся
под
радугой
Книга детских стихов
Слонимское литературное объединение
им.А.Иверса
Слоним
2008


Тамара
ПЕТЕЛИНА
«Осенний возраст –
это просто
зрелость»
Стихи


Пад гукі
паланэза
ЛІТАРАТУРНЫ
АЛЬМАНАХ


ВОЛАК
НАД
ШЧАРАЙ


Мікалай Емельянчук
ЕМЕЛЬКАВЫ
ЗАМАРОЧКІ


ЕМЕЛЬЯНЧУК
Николай Антонович
Проза
жизни













Кнігі ўдзельнікаў Слонімскага літаратурнага аб’яднання імя А.Іверса



Беларускі паэт са Слоніма Анатоль Іверс.



Сустрэчы ў сядзібе-музеі Н.Салейка. 28.08.2012. Слонім.





Творчая вечарына паэтэсы Ірыны Войтка. 18.11.2011.


В гостях у семьи Трофимович (Заремы Ивановны и Михаила Георгиевича). 29.09.2009.


Іван Сяргейчык на сустрэчы з моладдзю. 2005



Пасля прэзентацыі альманаха “Пад гукі паланэза”.



У гасцях у слонімскіх пісьменнікаў аўтары і супрацоўнікі часопіса “Вожык”.



50 год Івану Сяргейчыку.



Встреча литобъединения с Таисией Гуськовой. 05.07.2011. (Фото И.Прокофьева)



На сустрэчы з унучкай Я.Коласа В.Міцкевіч і мінскімі пісьменнікамі ў цэнтральнай бібліятэцы ім.Я.Коласа. Слонім, 07.10.2012.



Слонімскія паэтэсы Ірына Войтка і Алена Руж на сустрэчы з метадыстамі дзіцячых садкоў. Слонім, 05.11.2012.



На паседжанні літаратурнага аб’яднання імя А.Іверса. 2012




Паэтэса Ірына Войтка ў дзіцячай бібліятэцы ім.А.Пушкіна. Слонім. 22.02.2013




Свята паэзіі ў раённай дзіцячай бібліятэцы Слоніма. 20.03.2013.



Паэтэса Алена Руж у гімназіі №1 г. Слоніма на сустрэчы са школьнікамі. 19.10.2013.




Прэзентацыя кнігі Мікалая Емельянчука “Проза жыцця”. 22.11.2013